**АГП паставіла ўльтыматум ЦВК**

**Паводзіны Эўразьвязу выклікаюць «асьцярожны аптымізм»**

**Акцыя салідарнасьці разагнаная**

**Сусьветны банк хваліць Беларусь за эканоміку**

**Мінус 300 даляраў штогод**

**Дзяцей не пускаюць аздараўляцца за мяжу**

**Галівудзкая кампанія «Walt Disney» пачала здымкі свайго новага фільму ў Беларусі**

Беларускія ўлады стараюцца прадэманстраваць прагрэс у пытаньні правядзеньня выбараў адпаведна са стандартамі АБСЭ. Так, зь ініцыятывы Цэнтральнай камісіі па выбарах на гэтым тыдні быў арганізаваны паўторны паказ па тэлевізіі пяціхвілінных выступаў кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Гэтая навацыя стала адказам беларускіх уладаў на заўвагу назіральнікаў місіі БДІПЧ АБСЭ наконт таго, што ў краіне амаль што не адчуваецца вонкавых прыкмет агітацыйнай кампаніі.

Сапраўды, на думку палітолягаў, улады за папярэднія гады адпрацавалі мэтодыку «ціхіх» выбараў, якія практычна не заўважае абыватаь.

Палітызацыя грамадзтва ў зьвязку з электаральнымі кампаніямі кіроўным вярхам недарэчы. Таму агітацыйныя магчымасьці кандыдатаў жорстка абмежаваныя. Дзяржава выдае ім на плякаты ды ўлёткі суму, эквівалентную 800 даляраў. Гэтага стае на сьціплы наклад невыразнай чорна-белай прадукцыі. Выкарыстоўваць уласныя




photo.bymedia.net

ці спонсарскія сродкі, дапамогу з-за мяжы закон кандыдатам забараняе. Для сустрэчаў з выбарнікамі мясцовая «вэртыкаль» звычайна вылучае ня самыя людныя месцы.

У выніку, як паказваюць незалежныя апытаньні, многія грамадзяне элемэнтарна ня ведаюць, хто балятуецца па іх акрузе, ня кажучы ўжо пра зьмест праграмаў.

Разам з тым, паводле зьвестак адмыслоўцаў Інфармацыйна-аналітычнага цэнтру пры Адміністрацыі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, якія зладзілі сацыялягічнае апытаньне ў жніўні, пра намер удзельнічаць у галасаваньні на верасьнёўскіх выбарах паведамілі 84,6% рэспандэнтаў. Не зьбіраюцца ісьці на выбары трохі болей за 9% апытаных, а тых, хто ня вызначыўся ў гэтым пытаньні, каля 6%.

Чэрвеньскае апытаньне, праведзенае Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (Вільня), дало крыху іншы расклад. На пытанне «Ці будзеце вы ўдзельнічаць у галасаваньні на парлямэнцкіх выбарах 2008 году?» станоўча адказалі 53,0% апытаных беларусаў, адмоўна — 18,4% (27,4% адказалі, што яшчэ ня вырашылі, 1,2% не адказалі наагул).

Безумоўна, ад чэрвеня да жніўня доля ахвотных прагаласаваць магла ўзрасьці, але наўрад ці на 30% зь лішкам. Некаторыя незалежныя экспэрты робяць выснову, што ўлады, як і падчас папярэдніх

кампаній, маюць намер забяспечваць высокую яўку выбарнікаў адміністрацыйнымі мэтадамі.

У прыватнасьці, раней да траціны выбарнікаў галасавалі датэрмінова. Беларускае заканадаўства прадугледжвае пяць дзён датэрміновага галасаваньня перад самім днём выбараў. Так, сёлета выбары ў ніжнюю палату Нацыянальнага сходу прызначаныя на 28 верасьня, аднак для датэрміновага галасаваньня ўчасткі адчыняюцца ўжо з 23 верасьня.

На думку апазыцыі, менавіта датэрміновае галасаваньне, на якое многіх (асабліва вайскоўцаў, студэнтаў, жыхароў рабочых інтэрнатаў, сялян) змушаюць ісьці, ствараe спрыяльную глебу для фальсыфікацыяў. Бо цягам пяці сутак бюлетэні ў скрынях не кантралююцца незалежнымі назіральнікамі і могуць быць падмененыя.

Таксама, па вэрсіі апазыцыі і праваабаронцаў, фальсыфікацыі могуць адбывацца і на стадыі складаньня выніковых пратаколаў участковых камісій, калі замест рэальных лічбаў упісваюцца «патрэбныя». Доступ назіральнікаў да падліку галасоў ускладнены. А кожны з шараговых сяброў камісіі звычайна лічыць толькі свой стосік бюлетэняў, потым паведамляе вынік сваёй працы старшыні — і проста ня ведае агульнай карціны.

Не выпадкова, зазначаюць апазыцыянэры, менавіта ва ўчастковыя камісіі, што фармуюцца мясцовымі ўладамі, прадстаўнікі апазыцыйных партый фактычна ня трапілі. Іх аказалася меней за паўсотні сярод амаль што 70 тысяч сяброў камісій найніжэйшага зьвяна.

Разам з тым улады без праблем улучылі прадстаўнікоў апазыцыйных партый у склад Цэнтральнай камісіі па выбарах — з правам дарадчага голасу. Гэтае рашэньне стала нагодай для афіцыйнага піяру як прыклад дэмакратызацыі выбарчага працэсу. Разам з тым рэальнага ўплыву на дзейнасьць Цэнтарвыбаркаму апазыцыянэры ня маюць.

Напрыклад, на пасяджэньні 18 верасьня ЦВК адмовіўся разглядаць скаргі, якія прапанавалі сябры гэтай камісіі з правам дарадчага голасу. У прыватнасьці, была просьба разабрацца, чаму Барысаўская друкарня не друкуе перадвыбарчыя матэрыялы кандыдатаў ад Аб'яднаных дэмакратычных сіл Анатоля Лябедзькі, Станіслава Багданкевіча ды іншых. «Мы ня ў стане абмяркоўваць цэлы дзень плёткі і чуткі», — заявіла, як паведамляе «Радыё Свабода», кіраўніца ЦВК Лідзія Ярмошына.

Вялікі рэзананс у краіне і за мяжой выклікаў разгон міліцэйскім спэцназам 16 верасьня ў Менску акцыі «Мы памятаем!», прысьвечаной зьніклым палітыкам. Падчас разгону былі зьбітыя некалькі апазыцыянэраў. З гэтае нагоды кіраўніцтва Аб'яднаных дэмакратычных сіл зьвярнулася са скаргай у пракуратуру.

Раней былі і болей брутальныя прыклады ўжываньня паліцэйскай сілы супраць апазыцыі. Але зараз, калі міжнародныя назіральнікі пільна сочаць за палітычнай атмасфэрай у краіне, гэты інцыдэнт асабліва б'е па іміджы дзяржаўнага кіраўніцтва. Паводле лідэра Руху «За Свабоду», былога кандыдата на прэзыдэнта Аляксандра Мілінкевіча, разгон акцыі 16


photo.bymedia.net

верасьня — «велізарная памылка ўладаў», бо зусім не спрыяе дыялёгу афіцыйнага Менску з Эўразьвязам.

У інтэрвію «Радыё Свабода» Мілінкевіч выказаў думку, што ва ўладзе таксама ідзе барацьба паміж тымі, хто за сілавыя захады, і тымі, хто разумее, што «гэтая палітыка — учорашні дзень». Захад у адказ на разгон акцыі не прыпыніць дыялёгу зь беларускімі ўладамі, але выкажа вялікае шкадаваньне, мяркуе апазыцыйны палітык.

Такая ж барацьба ідзе паміж эканамістамі-рыначнікамі ды артадоксамі ва ўрадзе, адзначаюць аналітыкі. Перамогай рыначнікаў стала скасаваньне днямі пастановы ўраду № 179, якая пагражала разарыць многіх імпартэраў, асабліва прадстаўнікоў сярэдняга ды дробнага бізнэсу. Рэзкая рэакцыя бізнэс-супольнасьці прымусіла ўрадоўцаў спачатку пайсьці на дыялёг, а потым і скарэктаваць непапулярнае рашэньне аб жорсткім абмежаваньні гандлёвай надбаўкі на імпартныя тавары.

Варта патлумачыць, што да абмежаваньня імпарту ўрад падштурхоўваюць трывожныя паказчыкі замежнага гандлю. За шэсьць месяцаў сёлета адмоўнае сальда замежнага гандлю таварамі і паслугамі паводле мэтадалёгіі плацежнага

балянсу дасягнула 1 млрд. 762,1 млн. даляраў, паведаміла днямі Міністэрства статыстыкі і аналізу.

Эканамічныя імпэратывы змушаюць да рэформаў. Паводле сьвежай справаздачы “Doing Business-2009”, у якой даецца ацэнка 181 эканоміцы сьвету ў пытаньні прастаты ўмоваў вядзеньня бізнэсу, Беларусь увайшла ў лік краінаў-рэфарматараў нарматыўна-прававой сфэры. Паведамляецца, што Беларусь ажыцьцявіла рэформы ў шасьці зь дзесяці галінаў, якія дасьледаваліся аналітыкамі, і ў выніковым рэйтынгу выйшла з другой сотні на 85-ю пазыцыю.

Гэта яшчэ не прарыў, але несумненны прагрэс, канстатуюць незалежныя беларускія эканамісты. Яны заўважаюць, аднак, што паводле якасьці падаткавай сыстэмы краіна па-ранейшаму на апошнім месцы ў сьвеце.

ПАЛІТЫКА

## АГП паставіла ўльтыматум ЦВК

***Кандыдаты ў дэпутаты ад Аб’яднанай грамадзянскай партыі заявілі пра магчымасьць зьняцьця сваіх кандыдатураў з выбараў. Гаворка ідзе пра кандыдатаў па Менскай акрузе — Анатоля Лябедзьку, Станіслава Багданкевіча, Аляксандра Дабравольскага, Валянціну Палевікову, Ганну Ягораву й Кацярыну Маласаеву.***

Кандыдаты накіравалі адпаведную скаргу ў Цэнтарвыбаркам. Справа ў тым, што ўсе спробы надрукаваць выбарчыя матэрыялы закончыліся нічым. Ніводная друкарня не пагадзілася супрацоўнічаць з гэтымі кандыдатамі, спасылаючыся на розныя прычыны. У заяве, накіраванай у Цэнтральную выбарчую камісію, пастаўлены ўльтыматум: калі цягам тыдня апазыцыйным кандыдатам не дазволяць надрукаваць свае выбарчыя матэрыялы, іх кандыдатуры будуць зьнятыя з выбараў.

АФІЦЫЙНА

## Паводзіны Эўразьвязу выклікаюць «асьцярожны аптымізм»

***Станоўчыя сыгналы з боку Эўразьвязу ў двухбаковых адносінах выклікаюць асьцярожны аптымізм, заявіў прэс-сакратар Міністэрства замежных справаў Беларусі Андрэй Папоў. Беларусь заўважае зьмену танальнасьці ў адносінах да Беларусі ў дакумэнце, прынятым па выніках паседжаньня міністраў замежных справаў Эўразьвязу ў Брусэлі.***


newsby.org

Паводле Андрэя Папова, спроба ЭЗ палепшыць адносіны зь беларускім бокам не засталася незаўважанай. Гэта выклікае «асьцярожны аптымізм». Аднак «канчаткова пазбавіцца характэрнага для Эўразьвязу падыходу да Беларусі не ўдалося», падкрэсьліў прэс-сакратар МЗС.

Напрыканцы Андрэй Папоў дадаў, што беларускі ўрад чакае ад Эўразьвязу не дэклярацыяў, а канкрэтных крокаў.

АПАЗЫЦЫЯ

## Акцыя салідарнасьці разагнаная

***Увечары 16 верасьня акцыя салідарнасьці зь сем’ямі зьніклых у Менску мірна працягвалася прыкладна дзьве хвіліны. Удзельнікі пікету былі жорстка разагнаныя міліцыяй, многія былі зьбітыя.***


photo.bymedia.net

Акцыя была наладжаная па ініцыятыве Палітрады Аб’яднаных дэмакратычных сілаў. Каля 18 гадзіны на Кастрычніцкай плошчы сабралася блізу 40 чалавек, сярод іх — большасьць лідэраў АДС. Удзельнікі трымалі ў руках здымкі зьніклых — Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Зьмітра Завадзкага й Анатоля Красоўскага, а таксама бел-чырвона-белыя й зьвязаўскія сьцягі.

З самага пачатку пікетоўцаў папярэдзілі пра тое, што акцыя несанкцыянаваная.


photo.bymedia.net

Калі людзі не разышліся, іх пачалі выцясьняць з Кастрычніцкай плошчы. Супрацоўнікі АМАПу прымянілі сілу. Між іншым, былі моцна зьбітыя лідэр АГП Анатоль

Лябедзька, намесьнік старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка, яго-ны сын Франак Вячорка ды іншыя. Амапаўцы нішчылі сьцягі, забіралі здымкі зьніклых.

Акцыі салідарнасьці зь сем'ямі зьніклых адбыліся ў некалькіх іншых краінах. У Варшаве пад Міністэрствам замежных справаў прайшла акцыя супраць лібэралізацыі адносінаў зь беларускімі ўладамі.

ЭКАНОМІКА

## Сусьветны банк хваліць Беларусь за эканоміку

*Дырэктар аддзелу Ўкраіны, Беларусі й Малдовы Сусьветнага банку Марцін Райзэр назваў эканамічную сытуацыю Беларусі ўстойлівай.*

Экспэрты банку неўзабаве прадставяць справаздачу пра ўмовы вядзеньня бізнэсу. Прадстаўнік банку заявіў у эфіры каналу АНТ, што рэформы ў Беларусі ідуць у слушным напрамку, хаця гэта не азначае, што зроблена ўсё неабходнае.

Далейшыя посьпехі залежаць ад таго, ці краіна будзе прытрымлівацца абранага курсу лібэралізацыі эканомікі. Пэрспэктывы ў Беларусі добрыя — яна знаходзіцца паміж двума рынкамі, якія актыўна разьвіваюцца, мае высокаадукаваныя працоўныя рэсурсы. Ацэньваючы шанцы краіны ўвайсьці ў трыццатку самых прываблівых з інвэстыцыйнага пункту гледжаньня краін сьвету, Марцін Райзэр дыпляматычна адказаў, што неабходна разгледзець гэтае пытаньне больш дэталёва.

## Мінус 300 даляраў штогод

*Беларусы пераплачваюць па 300 даляраў за прадукты харчаваньня. Да такой высновы прыйшоў незалежны эканаміст Яраслаў Раманчук.*

Экспэрт у галіне эканомікі зазначае, што рэальныя даходы насельніцтва зьмяншаюцца ў хуткім тэмпе з-за высокіх коштаў на прадукты харчаваньня. У выніку кожная беларуская сям'я пераплачвае па 300 даляраў у год толькі за прадукты харчаваньня.

Яраслаў Раманчук зазначае, што кошты тавараў, якія сабе могуць дазволіць бедныя, растуць значна хутчэй. Багатыя людзі часта не адчуваюць рост цэнаў так значна, як сярэдні кляс, паколькі большасьць пакупак робяць за мяжою. Паводле словаў эканаміста, да канца бягучага году кошты 70% тавараў падымуцца на чарговыя 30%.

ГРАМАДЗТВА

## Дзяцей не пускаюць аздараўляцца за мяжу

*Дыпляматычныя прадстаўніцтвы некаторых краінаў у Беларусі пацьвярджаюць інфармацыю пра тое, што праграма аздараўленьня беларускіх дзяцей за мяжой прыпыненая, паведамляе БелаПАН.*

Афіцыйныя ўлады гэтай інфармацыі не пацьвярджаюць, аднак адразу папярэджваюць, што для аздараўленьня беларускіх дзяцей за мяжой неабходна падпісаць двухбаковае пагадненьне з краінамі, якія хочуць узяць дзяцей.

Як паведамілі БелаПАН у амбасадзе Вялікабрытаніі, прадстаўніцтва ведае пра прыпыненьне аздараўленьня дзяцей з чарнобыльскай зоны, аднак ніякіх афіцыйных дакумэнтаў па гэтым пытаньні не атрымлівала. Таксама ў амбасаду не паступала ніякай інфармацыі наконт магчымай дамовы пра супрацоўніцтва паміж краінамі.

Падобна на тое, забарона зьвязаная з выпадкам непаўнагадовай грамадзянкі Беларусі Тацьцяны Казыры, якая не вярнулася дахаты пасьля аздараўленьня ў ЗША.

КУЛЬТУРА

## Галівудзкая кампанія «Walt Disney» пачала здымкі свайго новага фільму ў Беларусі

*У стужцы «Кніга майстроў» зьявяцца такія пэрсанажы, як Баба-Яга, Русалкі й Кашчэй Бесьсьмяротны. Першыя сцэны фільму здымаюцца менавіта ў Беларусі, паведамляе БелТА.*

Сюжэт фільму засакрэчаны. Аднак аўтары стужкі кажуць, што фільм нагадвае вядомую казку «Марозка», толькі з маштабнымі батальнымі сцэнамі.

З «Walt Disney» супрацоўнічае студыя Мікіты Міхалкова. Вядома, што роль Кашчэя Бесьсьмяротнага будзе іграць Гоша Куцэнка. Галоўных герояў іграюць дэбютанты Максім Лакціёнаў і Марыя Андрэева. У фільме таксама здымаюцца Міхаіл Яфрэмаў, Валянцін Гафт, Леанід Кураўлёў і Артур Смальянінаў.

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

ERB
EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap.
The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.